Смерць нямецкім захопнікам!

Прачытаў—перадай другому.

# ЗА СОВЕЦКУЮ БЕЛАРУСЬ

Орган Лагойскага Раённага Камітэта КП(б)Б і Н-скага партызанскага атрада.

№32 (844) | Пятніца, 29 кастрычніка | 1943 г.

**Няхай жыве Ленінска — Сталінскі Комсамол—верны памочнік большэвіцкай партыі!**

# СЛАВА НАШАЙ СОВЕЦКАЙ МОЛАДЗІ!

## Слаўны юбілей

Сення спаўняецца 25 год са дня заснавання Ленінска — Сталінскага Комсамола. Усесаюзны Ленінскі Комуністычны Саюз Моладзі з'яўляецца масавай беспартыйнай арганізацыяй, прымыкаючай да ВКП(б), аб'ядноўвае у сваіх радах шырокія пласты перадавой працоўнай моладзі горада і вёскі. ВЛКСМ з'яўляецца памочнікам ВКП(б) і яе рэзервам.

Слаўны комсамол за час Айчыннай вайны паказаў сябе, як сапраўдны змагар за справу свайго народа. Комсамольцы бязмежна адданы сваёй Радзіме. Яны праяўляюць выключны гераізм на фронце і ў тылу ворага. Выхаванцы Ленінска — Сталінскага комсамола бязлітасна б'юць паганую немчуру, гераічна змагаюцца за хутчэйшы разгром фашысцкай арміі і вызваленне нашай Радзімы ад ненавісных акупантаў. Сто тысяч комсамольцаў і комсамолак за час Айчыннай вайны совецкім урадам узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Імёны маладых патрыётаў Герояў Совецкага Саюза Талаліхіна, Малодчыя, Н. Аніпава, Б. Сафонава, Ф. Смалячкова і другіх вядомы усяму совецкаму народу. Неувядаемай славай пакрылі сябе комсамольцы і комсамолкі ў абароне гарадоў-герояў—Сталінграда, Ленінграда, Севастопаля і Одэсы.

Комсамольцы знаходзяцца ў перадавых радах народных мсціўцаў. Сотні тысяч маладых юнакоў і дзяўчат вядуць гераічнае змаганне з ненавіснымі акупантамі і ў тылу ворага. Многім маладым партызанам і партызанкам прысвоена званне Героя Совецкага Саюза, сярод іх Зоя Космедзем'янская, Ліза Чайкіна, браты Ігнатавы, А. Чэкалін, Кузін, М. Сільніцкі, В. Курыленка і другія.

Гераічна змагаюцца з нямецкімі акупантамі і комсамольцы нашага раёна. Усе добра ведаюць комсамольцаў - партызан Надзю Харчанка і Андрэя Ш. Яны знішчылі многа гітлераўцаў і самі загінулі смерцю герояў.

У сваім пісьме да таварыша Сталіна наш комсамол перад Радзімай, перад усім народам даў урачыстую клятву бязлітасна граміць ворага да поўнага яго знішчэння. „Ні адна дарога,—пішуць комсамольцы,—не акажыцца для нас цяжкай... Клянёмся мы,

Что после победы, украсим, отстроим
Сожжённые сёла врагом, города!“

## Ад Совецкага Інформбюро

### З аператыўных зводак з 23 па 29 кастрычніка

Войскі 4-га Украінскага фронта пасля многадзённых баёў 23 кастрычніка поўнасцю авалодалі горадам і чыгуначнай станцыяй Мелітопаль —важнейшым і моцна ўмацаваным вузлом абароны праціўніка на паўднёвым напрамку.

Войскі 3 Украінскага фронта, пры падтрымцы войск 2 Украінскага фронта, 25 кастрычніка з баямі авалодалі вялікім абласным цэнтрам Украіны—горадам Днепрапетроўск, горадам Днепрадзяржынск, а таксама занялі 40 другіх населёных пунктаў, у тым ліку чыгуначныя станцыі Баглей, Сухачоўка, Вайцяхова.

На паўднёвы захад ад г. Мелітопаль войскі 4 Украінскага фронта, прадаўжаючы пашыраць прарыў абароны праціўніка, авалодалі радам моцна ўмацаваных пунктаў. На працягу 26 кастрычніка нашы войскі на поўдзень і паўднёвы захад ад г. Мелітопаль працягвалі развіваць наступленне і, прасунуўшыся наперад ад 7 да 20 кілометраў, занялі звыш 28 населёных пунктаў.

У раёне ніжняга цячэння Днепра нашы войскі зламалі абарону праціўніка і, наступаючы ў напрамку да Азоўскага мора, за 26 і 27 кастрычніка прасунуліся наперад ад 12 да 40 кілометраў і занялі больш 50 населёных пунктаў, у тым ліку раённыя цэнтры Запарожскай вобласці Васільеўка, Міхайлаўка, Агімаўка, Ніжнія Серагозы.

У вусцях Днепра, на паўднёвы захад ад Днепрапетроўска нашы войскі 27 кастрычніка прасунуліся наперад ад 6 да 15 кілометраў і занялі звыш 30 населёных пунктаў, у тым ліку раённы цэнтр Днепрапетроўскай вобласці Крынічкі.

На Крывароскім напрамку нашы войскі працягвалі развіваць наступленне і, прасунуўшыся наперад ад 11 да 18 кілометраў, занялі каля 100 населёных пунктаў.

На паўночны ўсход ад Віцебска нашы войскі, перамагаючы супраціўленне праціўніка, прасунуліся наперад ад 11 да 18 кілометраў занялі звыш 130 населёных пунктаў, у тым ліку раённы цэнтр Віцебскай вобласці г. Сураж.

На астатніх франтах—узмоцненыя пошукі разведчыкаў і артылерыйская перастрэлка.

Жр 3201

# МОЛАДЗЬ! МАЦНЕЙ УДАРЫ ПА ВОРАГУ!

## Маладыя воіны

У пераможных баях на Гомельскім напрамку мужнасць, доблесць і адвагу праяўляюць сотні маладых воінаў—выхаванцаў Ленінска—Сталінскага комсамола. За нашу родную Беларусь геройчна змагаюцца сумесна з воінамі рускім і беларусам воін украінец, казах, грузін, узбек, воіны ўсіх народаў Совецкай Радзімы.

Неўвядаемай славай у баях за Чарнігаў, у баях на падступах да Гомельшчыны пакрылі сябе маладые воіны-комсамольцы—Герой Совецкага Саюза малодшы лейтэнант Радзіонаў, Александр Чукароў, разведчык Осадчы. Іх ведае увесь фронт. Пра іх складаюць песні і легенды.

У комсамольца Барыса Кампанеец у часе боя асколкамі снарада вызела са строю кулямёт. Становішча стварылася сур'ёзнае. Тады Барыс Кампанеец кінуўся на нямецкага кулямётчыка, аўладаў яго зброяй і павярнуў нямецкі кулямёт супраць немцаў. Падраздзяленне пад прыкрыццём агня Кампанееца рушыла ўперад.

Узвод адважных разведчыкаў малодшага лейтэнанта Каторгіна прабраўся ў тыл ворага. Пачуўшы ўзрывы на чыгуначнай станцыі, байцы накіраваліся туды. На станцыі, на пуцях стаяла два саставы: адзін з нямецкімі салдатамі, другі з аўтамашынамі і боеприпасамі. Некалькі факельшчыкаў бегалі па платформе, рыхтуючыся падпаліць чыгуначныя пабудовы.

Марудзіць было нельга. Малодшы лейтэнант Каторгін загадаў адкрыць агонь з аўтаматаў і кулямётаў. З вагонаў пасыпаліся немцы. Разведчыкі падпалілі саставы. Сярод нямецкага гарнізона—паніка. Разведчыкі знішчыўшы некалькі сот гітлераўцаў, адстаялі станцыю.

Рэкап.

## Адважныя камандзіры

Выхаванцы Ленінска-Сталінскага комсамола т.т. Вася К. і Федзя М. з'яўляюцца лепшымі камандзірамі у нашым атрадзе. Яны чула і з вялікай любоўю адносяцца да сваіх байцоў і на асабістых прыкладах вучаць іх, як трэба змагацца з ненавісным ворагам-немцамі.

Атрад граміў гітлераўскі гарнізон у Косіне. Вялікая небяспека чакала таго, хто першым павінен быў кінуцца у смяротны бой. І як заўсёды, першым пайшоў Вася, ён раптоўна уварваўся ў дот і з гранатай у руках скамандаваў: „Рукі ўверх!". Ад нечаканага налёту гітлераўцы аслупянелі.

А вось другі прыклад. Комсамолец Федзя рашыў адзін пранікнуць у варожы гарнізон. Па дарозе да гарнізона яго затрымаў немец. Федзя не разгубіўся. Ён выхапіў наган і ва ўпор стрэліў у немца. З дзікім звярыным ровам вораг рухнуў на зямлю.

Камандзіры т.т. Вася К. і Федзя М. карыстаюцца заслужаным аўтарытэтам у атрадзе. У кожнага з іх на баявым рахунку па 5 забітых гітлераўцаў.

Комсамольцы Федзя і Вася прадстаўлены да ўзнагароды. С. Б-саў.

## КОМСАМОЛЬЦЫ ПОМСЦЯЦЬ ВОРАГУ

7 кастрычніка група партызан, якой кірує комсамолец тав. Канстанцін, спусціла пад адкос чыгуначны эшалон з жывой сілай ворага. Вяртаючыся з гэтай аперацыі, партызаны наладзілі засаду на шасейнай дарозе і знішчылі 1 грузавую аўтамашыну і 1 матацыкл з салдатамі.

Малады комсамолец тав. Міхаіл звязаўся з групай нямецкіх салдат і ў адзін з кастрычніцкіх дзён пры дапамозе гэтых салдат узарваў варожую аўтамашыну. Знішчана 14 гітлераўцаў.

## АНДРЭЙ

Андрэй Ш. не раз гаварыў сваім сябрам:

—Мы ганарымся тым, што жывём у шчаслівую совецкую эпоху. Права на шчаслівае жыццё нам завяявалі нашы бацькі ў дні Вялікага Кастрычніка. Сваёй крывёй мы павінны адстаяць яго ў будучых баях...

Гэта было да вайны. У 1941 годзе фашысцкая Германія па-зладзейску напала на нашу Радзіму. Чорныя хмары захінулі сонца над роднай беларускай зямлёй. Вялікае гора і пакуты абрушыліся на совецкі народ. Руіны, кроў і слёзы невінных людзей пакінулі за сабой нямецкія разбойнікі.

Андрэй доўга не раздумліваў. Ён уласнымі вачыма бачыў, якія дзікія зверствы твораць немцы. Ён добра ведаў чаго прыблукалася сюды гэтая нячыстая сіла.

— Не будзе жыцця ў нас, пакуль над намі будуць панаваць немцы, —падумаў Андрэй.—Жалезнай мятлой трэба іх гнаць адсюль. І ён, узяўшы ў рукі зброю, прылучыўся да народных мсціўцаў-партызан.

Суровым гневам да лютых ворагаў гарэла сэрца 19-гадовага юнака-комсамольца, бязлітасна помсціць ворагу, помсціць ворагу на кожным кроку,—адна думка ніколі не пакідала яго.

У атрадзе Андрэй быў самым смелым і дысцыплінаваным байцом. Усе заданні, якія давала камандаванне атрада, ён з гонарам выконваў.

Разам са сваімі сябрамі Андрэй не раз хадзіў на баявыя аперацыі, не раз удзельнічаў у гарачых схватках з ворагам. Не адзін гітлеравец знайшоў сваю смерць ад яго трапнай кулі. Не адна аўтамашына ворага ўзляцела ў паветра ад удела пастаўленай ім міны.

У пачатку гэтага месяца паблізасці аднаго варожага гарнізона разгарэўся жорсткі бой. Сілы былі няроўныя. Некалькі партызан вялі геройчнае змаганне з вялікай бандай гітлераўцаў. У гэтым баю ўдзельнічаў і Андрэй.

Трапным агнём касіў ён ворага. Вось ужо некалькі гітлераўцаў знайшлі сваю смерць. Аднак, варожая куля не мінавала Андрэя і прыкавала яго да зямлі, за якую ён паклявуся змагацца да апошніх сіл, не шкадуючы жыцця.

Андрэй загінуў. Ён памёр смерцю героя ў барацьбе супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Памяць аб героі-комсамольцу, які ўсёй душой любіў сваю Радзіму і ненавідзеў немцаў, будзе жыць вечна. Партызаны пакляліся адпомсціць за свайго сябру. З імям комсамольца-Андрэя яны ідуць у бой і перамагаюць.

Б. Ніўскі.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ.